НОВАЕ АБЛІЧЧА БДУ 3

ПРАЕКТ ПАД НАЗВАЙ «ДАЖЫНКІ» 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

1 ВЕРАСНЯ 2023 г. ПЯТНІЦА № 169 (30049)

Каштоўнасць ведаў

Навучэнцам, студэнтам, аспірантам, настаўнікам, навукова-педагагічным работнікам

Дарагія сябры!

Прыміце самыя цёплыя віншаванні з Днём ведаў і пачаткам новага навучальнага года.

Першага верасня — наша агульнае свята: усіх, хто прыступае да вучобы, хто вучыць і хто ўсё жыццё захоўвае самыя добрыя ўспаміны аб сваіх настаўніках.

Сёння школы, каледжы і ВНУ Беларусі адчынілі дзверы для амаль паўтара мільёна навучэнцаў і студэнтаў. Гэта важна, паколькі ў наш век каштоўнасць ведаў пастаянна расце і менавіта ўзровень нацыянальнай адукацыі вызначае бяспеку і дабрабыт дзяржавы. Галоўнае, каб моладзь выхоўвалася сапраўднымі патрыётамі і абаронцамі роднай зямлі, захоўвала традыцыі і гістарычную памяць.

Няхай кожны новы дзень будзе напоўнены старанной стваральнай працай і радасцю дзіўных адкрыццяў.

Асаблівыя віншаванні адрасую нашым першакласнікам і іх бацькам. Вы, самыя юныя школьнікі, сёння пачынаеце свой шлях у краіну ведаў. Верце ў сябе, і ў вас усё атрымаецца.

Жадаю ўсім мірнага неба, здароўя, цярпення, удачы і толькі выдатных адзнак.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Фота Андрэя ФЕАКІСТАВА.

Чацвёртакласнікі Грабаўскай сярэдняй школы Гомельскага раёна Мацвей ГАЛКО і Аляксандр КАЦАЛАПАЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Мы ні з кім цырымоніцца не будзем»

Прэзідэнт правёў пасяджэнне Савета бяспекі

Фота Бел ТА.

Пытанні, вынесеныя на разгляд, звязаныя з забеспячэннем нацыянальнай бяспекі краіны. Напружаная абстаноўка ў свеце і непасрэдна каля нашых граніц, санкцыйны ціск, па словах кіраўніка дзяржавы, не даюць нам магчымасці быць абсалютна спакойнымі і ўпэўненымі ў заўтрашнім дні. Краіны НАТА настойліва прасоўваюць палітыку свайго пашырэння, нарошчваюць ваенную прысутнасць вакол Беларусі, пастаянна праводзяць правакацыйныя вучэнні на нашых граніцах — і гэта яшчэ не ўсе дзеянні паўночнаатлантычнага альянсу, якія не могуць не насцярожваць.

Як патлумачыў Аляксандр Лукашэнка, свае дзеянні яны апраўдваюць нейкімі пагрозамі, што нібыта сыходзяць з тэрыторыі нашай краіны. «Кіраўніцтва Польшчы і краін Балтыі абвінавачвае Беларусь у нейкіх міфічных агрэсіўных намерах, якіх ніколі не было і быць не можа», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на нагнятанне з боку гэтых краін істэрыі з прычыны прысутнасці на нашай тэрыторыі супрацоўнікаў прыватнай ваеннай кампаніі «Вагнер». «Яны дастукаліся да таго, што ўжо патрабуюць неадкладнага вываду іх з Беларусі, — удакладніў Прэзідэнт. — Пры гэтым самі павялічваюць ваенныя бюджэты, сцягваюць да нашых граніц буйныя воінскія фарміраванні. Адказ просты — ні ў Польшчы, ні ў Літве, ні ў іншых краінах Балтыі не павінна быць ні аднаго замежнага ваеннаслужачага. Тады можна і нам прад'яўляць прэтэнзіі з нагоды прысутнасці тут ваеннаслужачых з іншых краін. А пакуль гэта неабгрунтаваныя і неразумныя патрабаванні. Нават не просьбы і прапановы, а патрабаванні».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў красавіку Варшава паведаміла аб рашэнні не выконваць Дагавор аб звычайных узброеных сілах у Еўропе ў дачыненні да нашай краіны. «Гэта фактычна апошні юрыдычны абавязвальны міжнародны акт у сферы кантролю за ўзбраеннямі, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — А вось гэта ўжо небяспечны крок. І мы заўсёды павінны палякаў, кіраўніцтва Польшчы аб гэтым папярэджваць, каб потым балюча не было».

СТАР. 2

КАРАТКА

• У Беларусі з 1 студзеня 2024 года мяняюцца падыходы да фінансавання дзейнасці дзяржаўных тэатраў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 жніўня падпісаў Указ № 275 «Аб падтрымцы асобных арганізацый культуры».

ISSN 1990 — 763X

Акцыя

У ШКОЛУ — З ПРАФСАЮЗАМ

«У школу з «Добрым Сэрцам», «Першы раз — у першы клас», «Збяром партфель першакласніку», «Дабрыня не мае меж», «Прывітанне, школа!» — гэтыя і іншыя акцыі з'яўляюцца часткай дабрачыннага марафону Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі «Прафсаюзы — дзецям». Штогод будучым першакласнікам, дзецям, якія выхоўваюцца ў малазабяспечаных і прыёмных сем'ях, напярэдадні Дня ведаў працягвае руку дапамогі галіновы прафсаюз. Сёлета Віцебская раённая арганізацыя Беларускага прафсаюза работнікаў АПК прыйшла з падарункамі і сертыфікатамі ў шэсць сем'яў Віцебскага раёна.

«Сабраць дзіця ў школу — нялёгкі квэст для бацькоў, асабліва калі маленькіх чамучак у сям'і некалькі. Добрай традыцыяй у раёне стала правядзенне дабрачыннай акцыі, у рамках якой галіновы прафсаюз дапамагае сваім працаўнікам неабходнай канцылярыяй і грашовымі сертыфікатамі. Пад увагай райкама знаходзяцца не толькі шматдзетныя малазабяспечаныя сем'і, але і дзеці старшынь прафсаюзных «пярвічак» сельгаспрадпрыемстваў раёна. Значную матэрыяльную дапамогу ў верасняўскіх клопатах сваім работнікам аказваюць і наймальнікі, што з'яўляецца для бацькоў добрай падтрымкай», — расказвае **прафсаюзны лідар аграрыяў Віцебскага раёна Таццяна ДЗІКАНАВА.**

СТАР. 3

«Мы ні з кім цырымоніцца не будзем»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт паставіў перад удзельнікамі пасяджэння пытанне — як мы павінны на ўсё гэта рэагаваць? «Я ўжо не кажу аб падрыхтоўцы на іх тэрыторыі нашых збеглых для ажыццяўлення ваеннага перавароту ў Беларусі, — заўважыў ён. — Зноў жа хачу папярэдзіць, што ў гэтым плане мы ні з кім цырымоніцца не будзем. Хоць трэба аддаць належнае: нашы збеглыя, якія знаходзяцца ў Польшчы, Літве і асабліва ва Украіне, разумеюць, для чаго іх там выкарыстоўваюць».

Пры ўсім гэтым, як каторы раз падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, Беларусь гатова да аднаўлення добрых адносін са сваімі суседзямі. «Як я казаў, іх не выбіраюць — яны ад Госпада Бога, — перакананы беларускі лідар. — Аднак у адказ на ўсе нашы пасылы ідуць толькі абвінавачванні і пагрозы. Значыць, ніякай нармалізацыі ім не трэба».

І ў пацвярджэнне сказанага Прэзідэнтам — з мэтай выключэння любых інсінуацый беларускі бок запрасіў прадстаўнікоў Польшчы ў якасці назіральнікаў на вучэнні АДКБ «Баявое братэрства — 2023», якія пачынаюцца ў Брэсцкім рэгіёне.

Вераніка КАНЮТА.

❍ **У тэму**

Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ: «СІТУАЦЫЯ ПРЫМУШАЕ ПАСТАЯННА БЫЦЬ ПІЛЬНЫМІ»

У размове з журналістамі **дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ** расказаў, што пасяджэнне Савета бяспекі, якое прайшло ў Палацы Незалежнасці, не было прысвечана пэўнай надзвычайнай сітуацыі. «Гэта абсалютна планавае мерапрыемства: Саветы бяспекі плануюцца, зацвярджаюцца Прэзідэнтам на год, — удакладніў ён. — Тым не менш тая геапалітычная абстаноўка, якая сёння складваецца ў свеце (у цэнтры падзей, натуральна, знаходзіцца і Рэспубліка Беларусь), датычыцца напрамую нашай краіны. Тэндэнцыі да абвастрэння абстаноўкі, тыя выклікі і пагрозы ўзаемазвязаны. Тэма Савета бяспекі — выпрацоўка шматлікіх мер, якія павінны стабілізаваць абстаноўку ў нашай краіне».

Прычым, як канкрэтызаваў Аляксандр Вальфовіч, гэта не толькі меры ваеннага характару, хоць сітуацыя, па яго словах, прымушае быць пастаянна пільнымі. Падчас пасяджэння таксама абмяркоўвалася сітуацыя і ў палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і дэмаграфічнай сферах.

«Прэзідэнт трымае на асабістым кантролі ўсё, што датычыцца пагроз у сферы нацыянальнай бяспекі, — адзначыў дзяржсакратар. — Яшчэ раз паўтаруся, наша краіна — міралюбівая краіна. Мы прадстаўляем міралюбівыя ініцыятывы. Асабліва яны накіраваныя на добрасуседскія адносіны з сумежнымі краінамі. (Суседзяў, як кажа Прэзідэнт, не выбіраюць, яны ад Бога.) У тым ліку бязвізавы рэжым наведвання нашай краіны з боку Польшчы, краін Прыбалтыкі — гэта свайго роду беларускі шэнген. На жаль, ён прыняты ў аднабаковым парадку. Мы прымаем меры, накіраваныя на добразычлівыя, добрасуседскія адносіны, а нам выстаўляюць нейкія патрабаванні і ўмовы: ствараюць чэргі на пунктах пропуску, закрываюць іх, пагражаюць закрыць граніцы. Напэўна, гэта дэмакратычныя каштоўнасці па-еўрапейску. Па-іншаму і не скажаш. Беларусь нікому не пагражае і не выпрацоўвае нейкіх пагражальных мер для бяспекі іншых краін. Наадварот, мы гатовы да супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння. Таму пасяджэнне Савета бяспекі і было прысвечана аналізу знешнепалітычнай абстаноўкі, тым пагрозам і выклікам, якія сёння ёсць у сферы перш за ўсё забеспячэння нацыянальнай бяспекі».

Шэраг прапаноў быў агучаны Прэзідэнту. Даручана іх абмеркаваць, дапрацаваць і прадставіць кіраўніку дзяржавы ў выглядзе пастанаўлення Савета бяспекі. Гэтыя рашэнні, як падкрэсліў Аляксандр Вальфовіч, накіраваны перш за ўсё на паляпшэнне ўмоў жыцця нашых грамадзян.

Віктар ХРЭНІН: «МЫ АДПРАЦОЎВАЕМ РЭАКЦЫЮ НА МАГЧЫМЫЯ РЫЗЫКІ І ПАГРОЗЫ»

Міністр абароны Віктар ХРЭНІН расказаў пра вучэнні АДКБ «Баявое братэрства — 2023», якія пачынаюцца 1 верасня. «Вучэнні больш носяць штабны характар, — адзначыў кіраўнік абароннага ведамства. — Калі паглядзець на гісторыю існавання АДКБ і правядзення гэтых вучэнняў, можна ўбачыць, што яны спланаваны на 10 гадоў наперад. Гэтыя вучэнні носяць выключны характар зладжвання структур АДКБ. Мы па выніках місіі ў Казахстане правялі шэраг пагаджальных нарад, убачылі праблему некаторай сумяшчальнасці нашых войскаў, унеслі адпаведныя змяненні ў дакументы. На гэтых вучэннях яны і будуць адпрацоўвацца і апрабоўвацца, але адбывацца гэта будзе ў асноўным на картах. Той кантынгент, які да нас прыбыў, зусім нешматлікі. Ён усюды ў нас задэкларацыраваны. Мы пазначылі, колькі менавіта прыехала ўдзельнікаў, на якіх палігонах дадзеныя вучэнні праходзяць. Працуем па прынцыпе «вучыць сваіх». Мы рыхтуем сваю армію, адпрацоўваем рэакцыю на магчымыя рызыкі і пагрозы».

Віктар Хрэнін паведаміў, што Беларусь запрасіла на вучэнні АДКБ «Баявое братэрства — 2023» назіральнікаў з Польшчы, аднак адказу ад іх пакуль няма. «Афіцыйна вучэнні пачынаюцца 1 верасня, паглядзім, на якім этапе (яны дадуць адказ. — **«Зв.»**), — сказаў міністр абароны. — Час да 6 верасня, калі адбудзецца завяршальны этап вучэнняў, ёсць. Калі ласка, чакаем у госці, пакажам сваю адкрытасць».

Тое, што вучэнні праходзяць у тым ліку на Брэсцкім палігоне каля польскай граніцы, з'яўляецца супадзеннем. Аднак нашы суседзі спрабуюць на гэтым спекуляваць. «Можам адзначыць, што вучэнні праходзяць адразу на некалькіх палігонах на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, а асноўны кантынгент, які ўдзельнічае ў іх, — гэта нашы Узброеныя Сілы», — канкрэтызаваў Віктар Хрэнін.

Практыка запрашэння замежных назіральнікаў беларускім ваенным ведамствам прымяняецца перыядычна. «Часта запрашаем апарат ваенных аташэ, якія прысутнічаюць у Беларусі: і на вучэнні, і на шэраг іншых мерапрыемстваў, якія мы праводзім, — патлумачыў міністр. — Часам прыязджаюць, часам — не».

Адказваючы на пытанне аб неабходнасці запрашэння замежных назіральнікаў у век развіцця тэхналогій і спадарожнікавых сістэм, кіраўнік ведамства адзначыў, што са спадарожнікаў перш за ўсё вядзецца схаваная разведка. «Мы бачым, як за намі сочаць са спадарожнікаў і з дапамогай іншых тэхналогій, — звярнуў увагу міністр. — Задача ж назіральнікаў — паглядзець тэматыку, якая адпрацоўваецца на вучэннях, і падрыхтоўку войскаў. Лепш раз убачыць усё самому, чым праз нейкую камеру».

Энергетыка

ЛІЧБАВЫ ДВАЙНІК ГАЗАТРАНСПАРТНАЙ СІСТЭМЫ

Міністр энергетыкі расказаў пра лічбавізацыю аб'яднання «Белпалівагаз»

Усе гарады, райцэнтры, пасёлкі, а таксама звыш 3600 сельскіх населеных пунктаў Беларусі газіфікаваны. За 30 гадоў агульная працягласць газаправодаў краіны павялічылася амаль у пяць разоў і цяпер складае каля 67 тысяч кіламетраў, а гэта амаль два віткі вакол Зямлі. Рэспубліка займае першае месца ў свеце па аб'ёмах здабычы торфу і вырабу паліўнага брыкету. Айчынныя тарфянікі штогод даюць каля 2 млн тон тарфяной прадукцыі. Доля торфу ў сістэме выкарыстання мясцовых відаў паліва складае 15 %, што дазваляе штогод замяшчаць каля 450 млн м³ прыроднага газу на вытворчасць энергіі.

МІРЫЯДА, ПАНАРАМА, ВЯРШЫНЯ

Па сістэме газаразмеркавання і аказання паслуг газазабеспячэння наша краіна займае адно з лідзіруючых месцаў на постсавецкай прасторы. Работа працягваецца, з'яўляюцца новыя інвестпраекты, скіраваныя на павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, расказаў **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ** падчас сустрэчы з журналістамі ў Рэспубліканскім дыспетчарскім цэнтры кіравання газаразмеркавальнай сістэмай прадпрыемства «Белпалівагаз»:

— Асаблівую ўвагу «Белпалівагаз» і Мінэнерга надаюць прымяненню новых сучасных тэхналогій, скіраваных на аўтаматызацыю і лічбавізацыю тэхналагічных працэсаў. Дзеля гэтага на базе прадпрыемства «Віцебскаблгаз» было створана спецыялізаванае структурнае падраздзяленне «АйТиГаз», дзе працуюць высокакваліфікаваныя праграмісты, якія распрацавалі ўсе праграмы для работы газатранспартнай сістэмы, так што мы абсалютна не залежым ад імпарту. Актыўная фаза распрацоўкі і ўкаранення праграмных прадуктаў цягнецца апошнія пяць гадоў. Усе комплексы працуюць надзейна, з элементамі інфармацыйнай і кібербяспекі. Пры гэтым яны ўдасканальваюцца, распрацоўваюцца іншыя праграмныя прадукты па іншых напрамках, каб максімальна ахопліваць іх тэхналагічныя працэсы.

У «Белпалівагазе» фактычна створаны лічбавы двайнік газатранспартнай сістэмы, які аб'яднаны ў адзіную аўтаматызаваную сістэму, што складаецца з трох узроўняў. Базавы ўзровень — мірыяда — уключае праграмы, скіраваныя на

аўтаматызацыю і лічбавізацыю тэхналагічных і бізнес-працэсаў. Гэта, у прыватнасці, пытанні складскога ўліку, газаразмеркавальнай сістэмы, функцыі «аднаго акна», абанентская служба, тэлеметрыя.

— Структурныя падраздзяленні газазабеспечвальных арганізацый выкарыстоўваюць іх падчас выканання сваіх асноўных функцый. Без гэтага праграмнага комплексу работа ўжо не выканаецца, — запэўніў міністр. — Інфармацыя пра ўсё, што адбываецца, — утрыманне, эксплуатацыя, рамонт, — уносіцца ў базу даных з выкарыстаннем гэтых праграмных комплексаў.

Сярэдні ўзровень — панарама — комплексная мультымедыйная праграма, якая забяспечвае комплексную ацэнку і аналіз працэсаў эксплуатацыі газатранспартнай сістэмы ў цэлым. У выпадку пазаштатных сітуацый ён дазваляе выбудаваць аптымальны алгарытм дзеянняў пры эксплуатацыі газаправода.

Верхні ўзровень — вяршыня — акумулюе ўсю аналітычную інфармацыю па краіне. Сама сістэма выдае пэўныя рэкамендацыі і прапановы, якія ў далейшым выкарыстоўваюцца кіраўніцтвам «Белпалівагаз» і Міністэрствам энергетыкі для далейшых дзеянняў.

ВОЧЫ Ў РЭЖЫМЕ РЭАЛЬНАГА ЧАСУ

Пры фарміраванні праграмных працэсаў неабходна ў рэжыме рэальнага часу адсочваць работу газатранспартнай сістэмы, і вачыма гэтай сістэмы з'яўляюцца дыспетчары. Усе газавыя сеткі і аб'екты алічбаваныя, і ў базе даных ёсць уся інфармацыя аб іх дзейнасці.

У краіне працуе 150 аварыйна-аднаўленчых брыгад, якія кругласутачна цягам пяці хвілін гатовы выехаць на вырашэнне любых задач. Штогод выконваецца каля 350 тысяч заявак, удакладніў Віктар Каранкевіч:

— Усе работнікі забяспечаны сучаснай тэхнікай, абсталяваннем, інвентаром, транспартам з GPS-трэкерамі. Гэта дазваляе адсочваць, дзе знаходзіцца машына, а сістэма пры атрыманні заяўкі і фарміраванні задання «падказвае» аптымальны маршрут і пэўную брыгаду з улікам адлегласці і месцазнаходжання работнікаў.

Супрацоўнікі брыгад маюць планшэты, на якія паступае ўся інфармацыя па сфарміраванай заяве. Сістэма па інфармацыі разумее, што патрэбны выезд брыгады на месца і бачыць, дзе знаходзіцца пашкоджанне газаправода. Праграмны комплекс яшчэ да моманту прыезду брыгады падказвае, што рабіць, якія прылады трэба адключыць, якія спажыўцы пры гэтым часова застануцца без газу, а дзе і ў якім аб'ёме паліва працягне паступаць.

У рэжыме анлайн, дарэчы, адсочваюць і правядзенне планавых работ, у тым ліку па тэхнічным абслугоўванні газавых прылад у насельніцтва. Уся інфармацыя па кожным абаненце ўнесена ў базу даных, таму газавікі дакладна ведаюць, якое абсталяванне маецца ў чалавека. Сістэма дапамагае сфарміраваць для адпаведнага спецыяліста план работы на наступны дзень адпаведна з колькасцю заяў і сфарміраваць аптымальны алгарытм руху для іх выканання і колькасць неабходных спецыялістаў.

Падчас работ кожны супрацоўнік мае праграмныя касы, з дапамогай якіх чалавек можа аплаціць паслугі тэхабслугоўвання карткай, а таксама атрымаць акт выкананых работ і квітак, удакладніў міністр.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Вышэйшая школа

НОВАЕ АБЛІЧЧА БДУ

Напярэдадні новага навучальнага года завяршылася другая чарга рэканструкцыі галоўнага корпуса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У гонар знамянальнай для ўніверсітэта падзеі адбылося сімвалічнае перарэзанне стужкі з удзелам кіраўніцтва, супрацоўнікаў і студэнтаў ВНУ.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ падкрэсліў, што цяперашняе мерапрыемства стала вынікам каласальнай трохгадовай работы. Ён таксама падзякаваў Міністэрству адукацыі і Савету Міністраў Беларусі за падтрымку і дапамогу ў рэалізацыі маштабнага праекта. За мінулы перыяд была праведзена рэканструкцыя і капітальны рамонт галоўнага корпуса, а таксама корпуса фізічнага факультэта, які прымыкае да галоўнага.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Адной з найважнейшых задач з'яўлялася аснашчэнне корпуса фізічнага факультэта ўнікальным навукова-адукацыйным абсталяваннем, многія ўзоры якога не маюць аналагаў у Беларусі і з'яўляюцца распрацоўкамі беларускіх вучоных. «Спецыяльна для нашых фізікаў выраблены аптычныя сталы. Непасрэдна навукоўцы фізічнага факультэта БДУ стварылі лазерны пінцэт, лазерны эмісійны спектрометр і сумесна з навукоўцамі з Акадэміі навук вырабілі ўстаноўку па кінетыцы фоталюмінесцэнцыі, — распавёў Андрэй Кароль. — Унікальнасць аптычнага пінцэта ў тым, што ён здольны захапіць і перамясціць аб'екты мікроннага і субмікроннага памеру з дапамогай светлавых прамянёў. Кажучы простымі словамі, гэта бескантактавы метад. Ён дазваляе дыстанцыйна кіраваць мікрааб'ектамі нават праз празрыстую перашкоду, напрыклад, праз шкло».

Сярод імпартазамяшчальнага абсталявання згадваліся таксама ўстаноўка іонна-прамянёвага распылення, аптычны мікраскоп, печка муфельная трохзонная. «Заўважу, што распрацоўкі нашых фізікаў выкарыстоўваюцца і для рэальнага сектара эканомікі. Напрыклад, была распрацаваная і ўжо выкарыстоўваецца люмінесцэнтная метка для каштоўных папер», — падзяліўся рэктар.

Віншаванні ад імя Міністэрства адукацыі на адрас калектыву БДУ агучыла **начальнік упраўлення вышэйшай адукацыі ведамства Алена ЛІПА**. Яна адзначыла, што БДУ за сваю векавую гісторыю стаў сапраўдным флагманам беларускай адукацыі і навукі ў нашай краіне. «Навуковыя школы, створаныя вашымі вучонымі, выдатныя навуковыя дасягненні і адкрыцці, шырока вядомыя не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Універсітэт захоўвае вернасць слаўным традыцыям, з кожным годам удасканальваючы адукацыйны працэс, укараняючы сучасныя методыкі і праграмы навучання», — падкрэсліла Алена Ліпа.

З падзякай да кіраўніцтва ВНУ і віншаваннямі звярнуўся **дырэктар НДІ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі БДУ акадэмік Юрый ХАРЫН**. Ён адзначыў, што інстытут заўсёды знаходзіўся ў галоўным корпусе, што дазваляла цесна супрацоўнічаць з профільнымі факультэтамі. «Мы ўдзячныя за абнаўленне плошчаў, адведзеных для работы інстытута, гэта ўзмоцніць нашу эфектыўнасць у галіне навуковых распрацовак і падрыхтоўкі студэнтаў». Юрый Харын таксама расказаў аб распрацоўках вучоных інстытута. Адна з іх шырока выкарыстоўваецца ў нашай краіне і датычыцца крыптаграфічнай абароны інфармацыі, у прыватнасці, гаворка ішла аб ID-картцы — электронным пашпарце грамадзяніна Беларусі.

Варта растлумачыць, што ў сувязі з вялікай плошчай галоўнага корпуса абнаўленне будынка і найбліжэйшай тэрыторыі праходзіць паступова, у чатыры этапы. Першы быў завершаны ў 2001 годзе. Да будаўніцтва другой, самай маштабнай, чаргі прыступілі ў 2020 годзе. Агульная адрэстаўраваная плошча склала 13531,3 метра квадратнага, гэта 354 адрамантаваныя памяшканні. На будаўніцтва былі выдзелены сродкі як з рэспубліканскага бюджэту, так і ўласныя фінансы БДУ.

За гэты перыяд выканалі дахавыя, электрамантажныя, сантэхнічныя і работы па адстройванні фасада і памяшканняў корпуса. Таксама былі закуплены новая мэбля для навучальных аўдыторый і сучаснае абсталяванне для лабараторый. Так, у абноўленых лабараторыях корпуса фізічнага факультэта плануецца правядзенне практычных заняткаў у рамках практыкумаў па агульнай фізіцы і радыёэлектроніцы, спецыялізаваных практыкумаў па біяфізіцы, біятэхналогіях, нанатэхналогіях, оптыцы, лазернай фізіцы і спектраскапіі.

Акрамя таго, былі выкананы работы па добраўпарадкаванні і азеляненні тэрыторыі ўнутранага дворыка, дзе замянілі тратуарную плітку, ажыццявілі пракладку тэлекамунікацый, дажджавой каналізацыі, устанавілі электрапад'ёмнікі для людзей з абмежаванымі магчымасцямі і велапаркоўкі, дапоўнілі паркавыя зоны новымі відамі раслін і кустоў.

Для вольнага часу студэнтаў з'явіліся спецыяльныя месцы. У прыватнасці, для правядзення мерапрыемстваў пад адкрытым небам устанавілі амфітэатр. Гэта паўкруглая канструкцыя з чатырма радамі сядзенняў, якая нагадвае рымскія збудаванні. Тут зможа размясціцца каля 200 чалавек. Да канструкцыі падведзены электрычная сетка, вонкавае асвятленне, выхад у інтэрнэт, ёсць таксама ўмовы для падключэння мультымедыйнага абсталявання».

Андрэй Кароль расказаў, што на дадзены момант распрацаваны праект рэканструкцыі галоўнага корпуса трэцяй і чацвёртай чэргаў, у рамках якіх плануецца рамонт 286 памяшканняў: сярод іх адміністрацыйныя кабінеты, Фундаментальная бібліятэка і Музей гісторыі БДУ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У ШКОЛУ — З ПРАФСАЮЗАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У апошнія жнівеньскія дні марафон добрых спраў завітаў да вялікай і дружнай сям'і Грачанікавых. Маці Аляксандра Сяргееўна працуе аграномам на Лужаснянскай сортавыпрабавальнай станцыі ўжо сёмы год. Там жанчына пазнаёмілася з будучым мужам, у 2019 годзе пара ўзяла шлюб. У 2020-м у сям'і з'явілася другое дзіця — дачка Альбіна, праз два гады — сынок Мірон. «Я не думала, што мая сям'я будзе такой вялікай. Нас з сястрой у бацькоў было дзве, але так склаўся лёс (і за гэта я вельмі ўдзячная), што цяпер мы выхоўваем траіх дзетак. Гэта нашы агеньчыкі шчасця, энергіі і любові», — дзеліцца Аляксандра.

Нягледзячы на тое, што цяпер жанчына знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, яна ўдала сумяшчае ролю шматдзетнай маці з заняткамі старшыні прафсаюзнай «пярвічкі» сортавыпрабавальнай станцыі. Хапае сіл і натхнення заставацца ў рабочым працэсе нават з дому. Добра, што з малымі ёй дапамагае старэйшая дачка Ліза — гонар сям'і. У свае 11 гадоў дзяўчынка паспявае не толькі выдатна вучыцца — яе імя занесена ў Кнігу «Першамайскія надзеі» аддзела па адукацыі адміністрацыі Першамайскага раёна горада Віцебска, — але і рэалізоўваць свой творчы патэнцыял у «Школе зорак», выступаць на «Славянскім базары». Сярэдняя дачка Альбіна пакуль наведвае дзіцячы садок, цягнецца больш да мастацтва: любіць маляваць, рабіць аплікацыі і ляпіць з пластыліну. Аднак, як расказвае Аляксандра, у свае тры гады мае характар і ўсё робіць па-свойму.

Збіраць дзяцей у школу, прызнаецца маці, нялёгка, але калі падыходзіць да такой справы паэтапна, то справіцца можна. Так, неабходную канцылярыю стараюцца набываць на працягу года патрошкі, а вось адзенне і абутак — перад Днём ведаў. Збіраць сяроднюю Альбіну ў дзіцячы садок прасцей — бацькі ў групе дамовіліся купляць неабходнае разам. «Дапамога галіновага прафсаюза сапраўды патрэбная. Прыемна, што сёлета вы прыехалі да нас. Спадзяёмся, што з новымі рэчамі і добрым настроем Ліза будзе вучыцца яшчэ лепш», — падзякавала Аляксандра Грачанікава.

Напярэдадні райкам прафсаюза работнікаў АПК завітаў у сям'ю трактарыста-машыніста агракомплексу імя М. П. Шмырова ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» Дзмітрыя Фадзеева, у якой выхоўваюцца дочкі Нэлі, Кіра і сынок Данііл. Школьнікі атрымалі каляровыя падарункі і адзначылі, што з такой «экіпіроўкай» хочацца хутчэй сесці за школьную парту.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіруючая партыя Грузіі абвінаваціла прэзідэнта ў парушэнні канстытуцыі з-за візіту ў ФРГ

Старшыня партыі «Грузинская мара — дэмакратычная Грузія» Іраклій Кабахідзэ заявіў, што падобны крок Саламэ Зурабішвілі з'яўляецца падставай для яе імпічменту, паведамляе ТАСС са спасылкай на грузінскі тэлеканал Imedi.

«Зразумела, што прэзідэнтам Грузіі вельмі груба парушаецца канстытуцыя. Яна давала прысягу гэтай канстытуцыі, аднак груба яе парушае. Гэта вельмі цяжкая з'ява, нам неабходна адрэагаваць на гэта. Гэта не застанецца без рэакцыі», — сказаў Кабахідзэ ў інтэрв'ю тэлеканалу, каментуючы візіт Зурабішвілі ў ФРГ. Палітык дадаў, што падобны крок прэзідэнта з'яўляецца падставай для яе імпічменту, аднак ён упэўнены, што гэтага не адбудзецца, бо апазіцыя ў парламенце прагаласуе супраць адстаўкі Зурабішвілі.

Адміністрацыя прэзідэнта Грузіі ў сераду паведаміла, што Зурабішвілі пачынае серыю замежных візітаў з мэтай надання рэспубліцы статуса кандыдата ў члены ЕС. Першы візіт быў запланаваны ў Германію ў чацвер. Пазней адміністрацыя грузінскага ўрада апублікавала заяву, у якой гаварылася, што Зурабішвілі апроч ФРГ было адмоўлена ў візітах у Бельгію, Балгарыю, Данію, Ізраіль, ААЭ, Польшчу, ва Украіну, у Чэхію і Швейцарыю.

Грант Шэпс прызначаны новым міністрам абароны Вялікабрытаніі

Пра гэта паведамляе тэлеканал Sky News са спасылкай на афіцыйную інфармацыю з Даўнінг-стрыт. Адзначаецца, што прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Рышы Сунак праводзіць перастаноўкі ў кабінеце міністраў.

Як пісала газета Financial Times, міністр па энергетычнай бяспецы Вялікабрытаніі Грант Шэпс нечакана стаў прэтэндэнтам на пасаду міністра абароны. Гэта будзе яго пятая пасада ў брытанскім кабінеце міністраў за апошні год. Ён ужо працаваў на пасадзе міністра транспарту, міністра ўнутраных спраў, міністра бізнесу і міністра энергетычнай бяспекі. На мінулым тыдні Шэпс наведаў Украіну.

Папярэдні кіраўнік Мінабароны Бэн Уолес раней аб'яўляў, што ён пакіне гэтую пасаду восенню і сыдзе з палітыкі. 31 жніўня прэм'ер-міністр Злучанага Каралеўства Рышы Сунак прыняў яго адстаўку. Бэн Уолес заявіў пры гэтым, што для яго было «прывілеем» служыць на гэтай пасадзе на працягу чатырох гадоў.

На пасаду міністраў энергетыкі і вугляроднай нейтральнасці каралеўства прызначана 38-гадовая парламенцкі намеснік міністра Вялікабрытаніі па справах дзяцей і сям'і Клэр Куцініьё. Пасаду Куціньё зойме дэпутат ад Кансерватыўнай партыі Дэвід Джонсан.

У Ёханесбургу больш за 70 чалавек загінулі ў пажары

У ноч на чацвер у сталіцы Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі загарэўся пяціпавярховы будынак. Дом, як паведамляюць СМІ, быў закінуты, але там незаконна пражывалі больш за 200 чалавек. Каб патушыць полымя, спатрэбілася некалькі гадзін. Пра 73 загінулых і яшчэ 52 пацярпелых паведамілі РІА «Новости» апоўдні чацвярга са спасылкай на прадстаўніка экстраннай службы горада Роберта Мулаўдзі. Узгаранне магло выклікаць незаконнае падключэнне да электрасеткі, дадало агенцтва.

Надвор'е

КУРС НА ВОСЕНЬ

Паніжэнне тэмператур, дажджы з навальніцамі і туманы прагназуюцца ў Беларусі з 1 да 6 верасня. Пра гэта паведамілі ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя.

У пятніцу, 1 верасня, месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 10—16 градусаў, месцамі па ўсходзе чакаецца да плюс 18 градусаў. Днём тэмпература паветра будзе вагацца ад плюс 19 градусаў па паўночным захадзе да плюс 26 градусаў па паўднёвым усходзе.

У суботу, 2 верасня, будзе пераважна без ападкаў, толькі раніцай і днём па паўднёвым захадзе месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 7 да плюс 14 градусаў, а днём — ад плюс 18 да плюс 25 градусаў.

У нядзелю, 3 верасня, месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённы час магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ноччу дасягне плюс 7—14 градусаў, а па паўднёвым захадзе — плюс 16 градусаў. Днём чакаецца плюс 18—25 градусаў.

У панядзелак, 4 верасня, ноччу месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Удзень прагназуецца пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Уначы сіноптыкі абяцаюць плюс 8—15 градусаў, а месцамі — плюс 6-7 градусаў. Днём будзе плюс 19—25 градусаў.

У аўторак, 5 верасня, месцамі па Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы, днём магчымы навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—15 градусаў. Днём паветра прагрэецца да плюс 18—24 градусаў, а месцамі — да плюс 26 градусаў.

У сераду, 6 верасня, месцамі па Беларусі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах згусціцца слабы туман. Уначы чакаецца плюс 7—14 градусаў. Днём слупкі тэрмометра паднімуцца да плюс 16—22 градусаў, а па поўдні — да плюс 25 градусаў.

Стыхія

ПАДЗЕННІ ДРЭЎ, ПАШКОДЖАНЫЯ ДАХІ І АЎТАМАБІЛІ

Мужчыну забіла ўдарам маланкі

Паводле аператыўных звестак, 30 жніўня з прычыны праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (да 23 м/с) пацярпелі 30 населеных пунктаў у 14 раёнах: Брэсцкай (тры), Віцебскай (шэсць), Гомельскай (два), Гродзенскай (два) і Мінскай (адзін) абласцях, паведамляе МНС.

Пашкоджаныя дахі 39 жылых дамоў, трох сацыякультурных і 13 сельскагаспадарчых будынкаў. Зафіксаваны 197 выпадкаў падзення дрэў у Брэсцкай (14), Віцебскай (11), Гомельскай (21), Гродзенскай (36), Мінскай (83), Магілёўскай (13) абласцях і ў Мінску (19). Павалеными дрэвамі пашкоджаныя дзевяць аўтамабіляў у Магілёўскай вобласці і ў Мінску. Пацярпелых няма. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па распілоўцы і прыборцы дрэў. Вяліся аднаўленчыя работы.

На жаль, непагадзь не абышлася без трагедый. Каля пасёлка Сасновы Асіповіцкага раёна 25-гадовага мужчыну забіла ўдарам маланкі. Высветлілася, што ён з двума таварышамі ехаў у аўтамабілі з боку Мінска. Спыніўшыся на абочыне, загінулы выйшаў з машыны. У гэты момант яго ўдарыла маланка. Медыкі канстатавалі смерць маладога чалавека.

Для забеспячэння бесперабойнай падачы электраэнергіі на малочнатаварнай ферме КСУП «Золак-Агра» ў вёсцы Судовіца Светлагорскага раёна быў задзейнічаны прычапны дызель-генератар Светлагорскага РАНС Гомельскага абласнога УМНС.

Паводле даных «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 1132 населеных пунктаў (Брэсцкая — 79, Віцебская — 210, Гомельская — 63, Гродзенская — 314, Мінская — 445, Магілёўская — 21), 104 сельскагаспадарчых будынкаў і 3540 трансфарматарных падстанцый. Адключэнні аператыўна выпраўляліся аварыйнымі брыгадамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Наш брэнд

Праект пад назвай «Дажынкі»

Наколькі ён аказаўся значным для Зэльвы

У гэтыя дні гарадскі пасёлак жыве падрыхтоўкай да абласнога фэсту хлебаробаў. Мясцовыя ўлады пастаянна ўдакладняюць ход работы, выязджаюць на аб'екты альбо вырашаюць важныя пытанні па мабільных тэлефонах. Каб атрымаць інфармацыю, журналістам іншы раз прыходзіцца шукаць адказных асоб па розных будаўнічых пунктах. І гэта зразумела: да знакавай падзеі застаецца некалькі тыдняў, таму важна ўсё паспець.

Фестываль «Дажынкі» ў нашай краіне стаў брэндам, хоць і праводзіцца на лакальным узроўні. Яго любяць усе, бо статус хлебароба па-ранейшаму высокі. Між тым, гэта яшчэ і аднаўленне населенага пункта. На бягучы год «казырная карта» выпала Зэльве. І пачалося... **Старшыня райвыканкама Дзяніс АЛЬШЭЎСКІ** назваў падзею гістарычнай для гарадскога пасёлка.

— Падзея значная з-за маштабаў падрыхтоўкі. Зэльва, лічы, абнавілася. Калі мы ў год праводзілі капітальны рамонт двух-трох вуліц, сёлета іх колькасць дасягае 16. Нам раней трэба было б гадоў шэсць-сем на гэта. Рэканструкцыя закранула і сацыяльныя аб'екты. Поўнасцю абноўленыя тры дзіцячыя садкі, дзве школы, паліклінічнае аддзяленне. Хутка ўвойдзе ў эксплуатацыю былы даўгабуд — цяпер гэта жылы дом. Увогуле ўсе аб'екты, якія датычаць выццядзейнасці нашых грамадзян, абноўленыя, — адзначыў кіраўнік раёна. — Сродкі ў асноўным атрыманыя з абласной інвестпраграмы, праграмы «Жыллё», рэспубліканскага дарожнага фонду. Усяго сёлета будзе асвоена каля 40 мільёнаў рублёў.

Разам з **начальнікам упраўлення архітэктуры, будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі райвыканкама Марынай ШЛЫК** выязджаем на самыя знакавыя аб'екты.

На гульнявых пляцоўках дзіцячага садка № 1 гамоняць маленькія жыхары гарадскога пасёлка. Яны прывыкаюць да новага аблічча свайго будынка. Пановаму выглядаюць фасад і агароджа. Амаль усе вокны новыя.

Па словах работніцы дзіцячага садка Чэславы Мармыш, са звычайнага цаглянага будынак ператварыўся ў каларытны, які радуе вока. Такая ж карціна склалася і з другімі двума садкамі. Усяго на рамонт дашкольных устаноў выдаткавана больш за 480 тысяч рублёў.

Ідзём да стадыёна. Аб'ект пад назвай «Колас» выглядае акуратным, хоць і невялікім па колькасці месцаў. Прыцягвае ўвагу бегавая дарожка з гумавай крошкі, зробленая па сучасных тэхналогіях. Па словах Марыны Шлык, цяпер сюды з задавальненнем прыходзяць мясцовыя аматары бегу, якія ўжо ацанілі якасць пакрыцця. Многія займаюцца на вечарах на вулічных трэнажорах, якія ўстаноўлены на спартыўнай пляцоўцы. Стадыён набыў сучасны выгляд у рамках падрыхтоўкі да фестывалю «Дажынкі». На аднаўленне разам з водаадводам і новым тратуарам выдаткавана больш за 500 тысяч рублёў.

Мая спадарожніца прапаноўвае паглядзець на былы даўгабуд, які перабудаваны пад жылы дом. Аб'ект 30 гадоў таму ўзводзілі пад паліклініку, планавалася, што тут будзе сем паверхаў. Некалькі разоў у Зэльве прыступалі да будаўніцтва. І вось цяпер той даўгабуд не пазнаць. Замест шэрых сцен паўстае шматпавярховік у цікавым архітэктурным рашэнні. Дзякуючы «Дажынкам» з'явіўся шанц яго завяршыць.

— Рэканструкцыя вядзецца пад 64-кватэрны жылы дом, дзе пераважная большасць — арэндная жыллё і плюс 12 кватэр сацыяльных. Разам з тыпавымі кватэрамі будзе дзевяць студый. На рэканструкцыю выдзелена дзесяць мільёнаў рублёў, урачыстае адкрыццё аб'екта адбудзецца напярэдадні «Дажынак». Пакуль будзем шукаць цікавую «фішку» для ўрачыстай цырымоніі, — заўважае мая суразмоўніца.

Па яе словах, у план падрыхтоўкі да абласнога фестывалю «Дажынкі-2023» у Зэльве ўключана каля 90 аб'ектаў. Большая частка ўжо здадзена ў эксплуатацыю.

Увогуле раён нядрэнна падыходзіць да свята хлебаробаў і на сельскагаспадарчай ніве. Ураджай збожжавых культур крыху ніжэйшы за леташні, але парадаваў рапс. Раён уваходзіць па дадзенай культуры ў тройку лідараў. Кукуруза мае добрыя перспектывы на ўраджай.

«Дажынкі» дапамогуць умацаванню партнёрскіх сувязяў, упэўнены старшыня райвыканкама. У рамках сельскагаспадарчага кірмашу ў Зэльве пройдзе II з'езд малых гарадоў Гродзенскай вобласці і Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі.

— Збіраемся падпісаць шэсць дагавораў аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве паміж шасцю раёнамі Гродзенскай і шасцю раёнамі Ніжагародскай абласцей, — паведаміў Дзяніс Альшэўскі. — З Ніжагародскай вобласцю мы цесна супрацоўнічаем, сябруем другі год. Многія гандлёвыя патокі цяпер скіраваныя на гэты расійскі рэгіён. Будзем супрацоўнічаць у адукацыі, культуры. Але галоўнае — эканоміка. Сёння вельмі шмат праграм паміж Беларуссю і Расіяй, дзе можна працаваць у розных праектах.

Дарэчы, госці з Расійскай Федэрацыі прыбудуць не толькі з дзелавым візітам, але і з творчымі калектывамі, якія выступяць на святочнай сцэне ў Зэльве. Свае вырабы прадставяць рамеснікі і майстры ўнікальных тэхнік дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Ступень гатоўнасці гарадскога пасёлка — у цэнтры ўвагі абласных улад. Днямі прайшло чарговае пасяджэнне абласнога штаба пад кіраўніцтвам першага намесніка старшыні аблвыканкама Юрыя Валяватага, які падкрэсліў, што варта прадумаць кожны пункт свята — ад сустрэчы дэлегацый да арганізацыі бяспекі.

Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.

г. п. Зэльва.

На адной хвалі

Чым жыве за кадрам шоу

Бадзёрыя і прыгожыя вядучыя ранішняга шоу «Добрай раніцы, Беларусь!» зараджаюць добрым настроем і пазітывам не толькі з экрана тэлевізараў. Цяпер «раннія птушкі» пакараюць таксама аўдыторыю папулярнай сацыяльнай сеткі TikTok, дзе некаторымі сваімі відэа збіраюць мільён праглядаў.

Такі спосаб быць бліжэй да аўдыторыі выбралі Ганна Квілорыя і Марыяна Муранкова, а заадно і паказаць закадравае жыццё працоўных будняў. У сацыяльнай сетцы дзяўчаты змяшчаюць вясёлыя відэа, якія дэманструюць, што адбываецца на здымачнай пляцоўцы па-за эфірам.

— Жыццё каманды «Добрай раніцы, Беларусь!» даволі вясёлае, але шмат з таго, чым мы хацелі б дзяліцца з нашымі гледачамі, застаецца па-за кадрам. Таму паступова мая старонка ў TikTok, дзе я публікавала відэа на розныя тэмы, ператварылася ў зборнік кароткіх эпізодаў з жыцця нашага шоу. А паколькі мая асноўная напарніца ў праграме — Марыяна Васілеўна, практычна ўсе нашы забаўляльныя відэа з яе ўдзелам, — дзеліцца Ганна Квілорыя.

На думку вядучых, відэа ў TikTok — добрая магчымасць дзяліцца сваімі ідэямі з вялікай аўдыторыяй. Аднак дзяўчаты не імкнуцца быць у трэндзе і капіраваць тое, што робяць усе навокал, а ў выбары кантэнту для публікацый аддаюць перавагу тым тэмам, якія чапляюць найперш іх саміх пры сустрэчы з гасцямі праграмы. «Мы не адсочваем, што знаходзіцца ў трэндах і топах, не прастаўляем спецыяльныя хэштэгі, — кажуць вядучыя. — Тут, як з песеннымі хітамі, — ніколі не ведаеш, што стрэліць. Але калі ўдаецца запаліць аўдыторыю ў TikTok і атрымаць зваротную сувязь у выглядзе праглядаў і каментарыяў, разумеем, што ўсё робім правільна».

Фота sb.by

Знаходзьце і падпісвайцеся на старонкі шоу і яго вядучай Ганны Квілорыі ў сацыяльных сетках ды будзьце заўсёды ў курсе таго, чым жыве «Добрай раніцы, Беларусь!». Там заўсёды цікава.

Алена ДРАПКО.

ШАШКІ («Звязда») Выпуск № 199

З архіўных сшыткаў:
Д. Гардзевіч — М. Гелер
Першынство БССР 1957 г. (адваротная гульня Бадзянскага)

1. c3-b4 h6-g5 2. g3-h4 b6-a5 3. b4-c5 d6:b4 4. a3:c5 c7-b6 5. c5-d6 e7:c5 6. e3-d4 c5:e3 7. d2:h6 b6-c5 8. f2-e3 b8-c7 9. h2-g3 c7-d6 10. b2-a3 f6-e5 11. a1-b2 d8-e7 12. e1-d2 e5-d4 13. g1-h2 d4:f2 14. g3:e1 g7-f6 15. b2-c3 h8-g7 16. h2-g3 f6-e5 17. e1-f2 c5-d4 18 .c1-b2 d6-c5 19. h4-g5? Глядзі дыяграму № 130. Скончыць партыю самастойна.

№ 130



№ 131 Рустам Шаяхметаў (Уфа)

Белыя простыя: e1, b2, c3, d4 (4)
Чорныя простыя: f4, b6, d6, f6 (4)

№ 132 Віктар Шульга (Мінск)
Белыя простыя : f2, h2, a3, e3, d4 (5)
Чорныя простыя: h4, a5, b6, c7, f8 (5)

№ 133 Мікалай Ляшкевіч (Мінск)
Белыя простыя: b2, f2, g3, f4, a5, e7 (6)
Чорныя простыя: d2, h2, a3, c5, h6, b8 (6)

У шашкі-100 кампазіцыі складзеныя вядучым рубрыкі.

№ 134
Белыя простыя: 41, 44, 40, 29, 24, 17, 11 (7)
Чорныя простыя: 36, 32, 35, 25, 13, 14, 2 (7)

№ 135
Белыя простыя: 47, 50, 41, 42, 43, 37, 24, 25, 19, 20 (10)
Чорныя простыя: 36, 33, 35, 26, 28, 22, 18, 11, 15, 7, 8 (11)

№ 136
Белыя простыя: 47, 48, 50, 41, 42, 37, 38, 29, 30, 25, 20 (11)
Чорныя простыя: 36, 39, 35, 26, 22, 24, 18, 19, 11, 15, 7 (11)

№ 137
Белыя простыя: 22, 17, 18, 20, 11 (5)
Чорныя простыя: 31, 27, 29, 30, 23, 6, 10 (7)

№ 138
Белыя простыя: 49, 43, 32, 22, 17, 18, 20, 11 (8)
Чорныя простыя шашкі: 40, 31, 29, 30, 23, 6, 10 (7)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Майстар Сяргей Латашынскі выйграў XXXII адкрыты рэспубліканскі турнір па шашках-64 «Ятвязь-2023». Турнір праходзіў у Драгічыне з удзелам 70 шашыстаў.

Анонс: 16—17 верасня ў Бярозе адбудзецца XII адкрыты рэспубліканскі турнір па падлогавых шашках-64. Галоўны суддзя — Бялецкі Віктар. Тэл. (029) 6499133.

Праверце свае рашэнні
Выпуск № 198 ад 18.08.2023.

№ 122 1. h6-g7 e7-f6
[1...g3-f2 2. b4-c5 d6:d2 3. c1:g1]
2. g7:c7 b8:d6 3. b4-c5 d6:d2 4. c1:g5 h4:f6 5. h2:f4+

№ 123 1. a7-b8 d6:b4 2. b6-a7 f8:d6 3. b8:d2
[3. b8:c1 g5:e7 4. g1-f2 e7-f6 5. a7-b8 d8-c7 6. b8:g7 h6:f8 7. h2-g3 h8-g7 8. f2-e3 d4:f2 9. g3:e1 g7-f6 10. c1-e3 f8-e7]
3...g5:e7 4. a7-b8 c3:e1 5. a1-b2 a3:c1 6. b8-c7 d8:b6 7. g1-f2 e1:g3 8. h2:f4 c1:g5 9. h4:f6+

№ 124 1. e7-d8 d6:b4 2. d8-e7 a7:c5 3. d2-e3 f2:d4 4. e7-d6 c5:e7 5. f6:d8 h4:f6 6. d8:c1+

№ 125 28, 23, 33, 32, 9, 4 (40), 43 (45), 40, 30, 44+.

№ 126 28, 23, 27, 37, 9, 4 (38), 40, 44, 44+.

№ 127 1. d6-e7 f8:b4 2. b2-c3 a7:g5 3. h2:f8 f6:b2 4. f8:g1+

№ 128 1. e7-f8 c5:g5 2. e5-d6 a3:e7 3. f8:f6 f4-g3 4. g7-h8 a1:g7 5. h8:h2 +

№ 129 1. h6-g7 c1:e3 2. e7-f8 c5:g5 3. e5-d6 a3:e7 4. f8:f6 f4-g3 5. g7-h8 a1:g7 6. h8:h2+

Першымі дакладныя адказы даслалі: Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.

Сядзі і глядзі

«БЕЛАРУСЬ 3» ПАКАЖА ТРАНСЛЯЦЫІ З ДНЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

У гэтыя выхадныя ў Гарадку Віцебскай вобласці пройдзе XXX Дзень беларускага пісьменства, які традыцыйна адзначаецца ў нашай краіне ў першую нядзелю верасня. З нагоды юбілейнага свята тэлеканал «Беларусь 3» падрыхтаваў насычаную тэматычную праграму, прэм'еры і прамыя трансляцыі асноўных мерапрыемстваў культурнага форуму.

З 1994 года маштабнае свята збірае гасцей у гістарычных цэнтрах беларускай культуры і навукі, знаёміць са шматлікімі матэрыяльнымі і духоўнымі каштоўнасцямі краіны. І сёлета здымачная група сацыякультурнага тэлеканала наведае ўсе пляцоўкі маштабнага мерапрыемства, пазнаёміцца з гасцямі і выступоўцамі, а таксама пакажа, чым будзе здзіўляць і радаваць Гарадок.

Да юбілейнага кніжнага фестывалю прымеркавана прэм'ера праекта «Рыфмаваныя пачуцці» — серыя відэаролікаў, у якіх юныя таленты чытаюць уласныя вершы на беларускай мове. Героі новага праекта, нягледзячы на малады ўзрост, пішуць творы, друкуюцца ў часопісах, могуць нават пахваліцца апублікаванымі кнігамі і маюць вялікую колькасць літаратурных узнагарод.

Напярэдадні гледачы сацыякультурнага канала мелі магчымасць згадаць душэўную і ўрачыстую атмасферу, якая штогод пануе на свяце. У эфіры паказвалі тэлеверсіі канцэртаў Дзён беларускага пісьменства, якія ладзіліся ў мінулыя гады. Таксама на працягу тыдня ў праектах «Люблю і памятаю», «Суразмоўнікі», «Кадры жыцця» тэлегледачы маглі згадаць кранальныя гісторыі жыццёвага і творчага шляху класікаў айчыннай літаратуры, а таксама паслухаць размовы з навукоўцамі, пісьменнікамі і паэтамі.

Што датычыцца сёлетняга мерапрыемства, урачыстае адкрыццё юбілейнага Дня беларускага пісьменства, якое адбудзецца 2 верасня, у эфіры «Беларусь 3» пакажуць у 21.00. Тэлегледачы змогуць атрымаць асалоду ад мастацка-тэатралізаванай дзеі «Анталогія Дня беларускага пісьменства».

Адной з ключавых падзей святочнага паказу стануць прамыя ўключэнні з імправізаванай студыі сацыякультурнага тэлеканала, якая два дні будзе працаваць у Гарадку. Вядучая Ганна Панцялеева падзеліцца падрабязнасцямі правядзення і сустрэнецца з удзельнікамі свята.

А ў нядзелю, 3 верасня, у 11.50 на тэлеканале адбудзецца прэм'ера дакументальнага фільма «Адзінка гарэння. Анатоль Аўруцін». Фільм, зняты з нагоды юбілею майстра слова, раскрывае яго гісторыю жыцця. Герой шчыра разважае пра месца паэта ў сучасным свеце, пра тое, якое ўздзеянне аказваюць лірычныя творы на чалавека. Здымачная група разам з Анатолем Юр'евічам наведае мясціны, дзе прайшло яго дзяцінства, і паразмаўляе з калегамі і сябрамі паэта. У гэты ж дзень у 14.00 тэлеаўдыторыю чакае прамая трансляцыя ўрачыстай цырымоніі закрыцця форуму і канцэртнай праграмы свята.

На працягу святочных дзён «Беларусь 3» пакажа мастацкія фільмы і спектаклі, пастаўленыя паводле твораў беларускіх літаратараў. У тэматычнай падборцы — тэлеверсіі спектакляў «Альпійская балада» Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, «Мікітаў лапаць» Тэатра-студыі кінаакцёра і «Паўлінка» Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, а таксама мастацкія стужкі, знятыя па матывах твораў А. Дударава, У. Караткевіча, І. Шамякіна. Самым маленькім тэлегледачам канал прапануе прагляд анімацыйнай стужкі «Я тайну ў глыбіні душы хаваю... Максім Багдановіч». Далучайцеся, і будзем святкаваць разам!

Алена ДРАПКО.

Смачная восень са «Звяздой»

